быть добродетельна и образована. До тех пор, пока уделом женщины будет праздность и суета, пока их будут считать куклами, капризными детьми, богинями, цветами, но только не людьми, в обществе не будет прочных устоев и по свету будут порхать Фрычо Вевюрские» [1, с. 88].

Эліза Ажэшка намагалася змяніць меркаванне адносна ролі жанчыны ў патрыярхальным асяроддзі, зрабіць жанчыну раўнапраўным членам грамадства. У цэлым, у другой палове XIX ст. такі пункт погляду станавіўся даволі распаўсюджаным сярод пісьменнікаў і навукоўцаў. Так, вядомы педагог К. Д. Ушынскі надаваў асаблівую ўвагу праблеме жаночай адукацыі і выхавання. Ён з'яўляўся прыхільнікам роўных правоў паміж мужчынам і жанчынай у адукацыі. Даследчыкі А. Г. Агальцова, А. В. Кашлоба і А. Н. Машкоўская казалі: «Як заснавальнік прынцыпу народнасці ў выхаванні, Канстанцін Ушынскі адзначаў уплыў жанчыны як будучай маці на фарміраванне маладога пакалення, рабіў акцэнт на гуманным характары адукацыі. На яго думку, жанчына павінна мець агульную адукацыю, псіхолага-педагагічную падрыхтоўку да выхавання новага пакалення» [2], што пацвярджае і думку Элізы Ажэшкі.

З тэмай жаночай адукацыі звязаны і вобраз Вэвюрскага, бо віну за яго нікчэмнасць, аб якой было сказана вышэй, пісьменніца ўскладае перш за ўсё на маці, якая не здолела па прычыне свайго невуцтва і абыякавасці выхаваць з яго станоўчага чалавека. Эліза Ажэшка непрымірыма ставіцца да малаадукаванай, хоць і той, якая любіць свайго сына, маці. Гэтак жа пісьменніца ставіцца і да вобраза бестурботнай прыгажуні Ізабэлы, якая аддала дзіця на выхаванне ў чужыя рукі. Ізабэла адносіцца «к числу тех, для кого в авантюрных блужданиях по свету ставкой является женское обаяние» [1, с. 82].

«У "Апошнім каханні" распрацоўка жаночай тэмы спалучаецца з тэмай выхавання новага чалавека, у адпаведнасці з пазітывісцкай ідэалогіяй прапагандуецца культ ведаў, грамадскай карыснасці» [3, с. 103], – заўважаецца ў артыкуле «Эліза Ажэшка: жанчына vs жанчыны?» Мікалаем Хмяльніцкім. Можна зрабіць выснову, што ў гэтым рамане для пісьменніцы галоўным становіцца пытанне аб наданні права жанчыне самастойна вырашаць свой лёс і будаваць сваё шчасце. Для Э. Ажэшкі заўсёды важным было жаночае пытанне, і менавіта жаночыя вобразы, якія стварыла аўтарка, прынеслі ёй славу. Э. Ажэшка патрабуе, каб у жанчыне бачылі чалавека і не ставіліся б да яе як да «кветкі» ці «лялькі». Роля жанчыны ў грамадстве, на думку пісьменніцы, надзвычай важная і ганаровая – перш за ўсё як выхаваўцеля будучых грамадзян.

**Літаратура**

1 Ожешко, Э. Последняя любовь / Э. Ожешко. – Москва : Государственное издательство художественной литературы, 1975. – 232 с.

2 Огольцова, Е. Г. Взгляды К. Д. Ушинского на проблему женского образования / Е. Г. Огольцова, А. В. Кошлоба, А. Н. Машковская. – Молодой ученый. – 2018. – № 46 (232). – С. 318–319.

3 Хмяльніцкі, Мікалай. Эліза Ажэшка: жанчына vs жанчыны? / Мікалай Хмяльніцкі // Маладосць. – 2016. – № 5. – С. 103–104.

**УДК 821.161.3-14*А. Вярцінскі**

***К. С. Афанасенка***

## ВАЙНА Ў ЖЫЦЦІ І ЛІРЫЦЫ А. ВЯРЦІНСКАГА

*Артыкул прысвечаны асэнсаванню вайны ў жыцці і лірыцы А. Вярцінскага. Актуальнасць тэмы даследавання заключаецца ў абранні мала вывучанага ў беларускім*



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*літаратуразнаўстве аспекту творчасці паэта. Аўтар прыходзіць да высновы, што Анатоль Вярцінскі – гэта адзін з нямногіх паэтаў, хто мае здольнасць закранаць чытачоў за жывое, ён мае вялікі талент выклікаць у чалавека тыя эмоцыі, якія адчуваюць яго лірычныя героі. Асноўны пафас ваенных вершаў А. Вярцінскага – пафас адстойвання чалавечнасці, гуманізму.*

Другая сусветная вайна з'яўляецца адной з самых запатрабаваных тэм у беларускай літаратуры XX ст. Гэты час абярнуўся для кожнага жыхара нашай краіны трагедыяй – такі асноўны лейтматыў ваеннай паэзіі А. Вярцінскага. Паэт, па словах І. Баўтрэль, «любіць мазкі шырокія і яркія. У яго калі навальніца – то з маланкай праз усё неба, калі шторм – то дзевяцібальны, калі вайна – то з усімі жахамі і болем» [1, с. 6]. А. Вярцінскі прынёс у нашу залатую скарбніцу такія знакамітыя лірычныя творы, як «Рэквіем па кожным чацвёртым», «Два полі», «Балада пра спаленую вёску і жывого пеўня», «Плач спаленай вёскі», «Маці на ўзгорку», «Многа ёсць на зямлі калек…» і інш.

Вытокі мастацкага светапогляду кожнага паэта зараджаюцца ў яго біяграфіі і, перш за ўсё, у эмацыйным вопыце дзяцінства, падзеях, перажытых у раннія гады жыцця. А. Вярцінскі нарадзіўся за некалькі гадоў да таго, як пачалася самая страшная і жудасная вайна, якая прыпала на долю нашых продкаў. Ён належыць якраз да пакалення творцаў, дзяцінства якіх было абпалена вайной, што, безумоўна, не магло не адбіцца на яго вершах. В. Русілка падкрэслівае: «Ды вось наймацнейшая дамінанта ўспамінаў пра маленства – ваенныя ўражанні, непазбаўнае адчуванне вялікай народнай бяды. Як згадвае паэт, побач з трагічным вайна настройвала і на "гераічнае"» [2, с. 5]. К. Цвірка таксама зазначае: «На ўсё жыццё запомнілася яму, як маці пякла хлеб з новага ўраджаю. Гэта было сапраўднае, доўгачаканае свята сям'і, у якой даўно паскрэбліся ўжо ўсе засекі. Анатоль Вярцінскі да драбніц узнаўляе, паэтызуе працэс выпечкі хлеба» [3, с. 242]. Гэта было дзяцінства, якое прайшло пад чорным дымам, крывавым небам, свістам куль і неперапынных выбухаў. А. Вашчанка ўзгадвае: «Адказваючы на пытанне анкеты, "які след пакінула ў вашай асабістай памяці вайна?" – ён зазначыць: "Вайна наклала глыбокі адбітак на нашу псіхалогію, на наша светаадчуванне, вызначыла ў значнай ступені нашу маральна-філасоўскую арыентацыю; вядома не толькі ў негатыўным, але і ў станоўчым сэнсе, у сэнсе нашай большай жыццястойкасці, больш устойлівага аптымізму"» [4, с. 154].

Менавіта таму так напружана і востра гучыць тэма вайны ў творчасці А. Вярцінскага. З. Драздова зазначае: «Нямала суровых і трагічных радкоў прысвечана Вярцінскім у 60-я гады ваеннай тэматыцы. Вершы паэта на тэму вайны былі вельмі прыкметнай з'явай ва ўсёй савецкай паэзіі. А. Лойка справядліва гаварыў пра раўналежнасць ваеннай лірыкі А. Вярцінскага з ваеннай прозай В. Быкава, адзначаючы зарыентаванасць абодвух мастакоў слова на адны і тыя ж ідэалы, на адзін і той жа курс – "паказ самай суровай праўды жыцця, на трагізм і драматызм народнага лёсу – пры маральным максімалізме, пры духоўным спаборніцтве з сіламі цемры"» [5, с. 450].

Вайна ў А. Вярцінскага – гэта страчанае дзяцінства, загубленыя мары пра светлую будучыню і добрае жыццё, пакуты слабых, бяздольных і безабаронных, незваротнасць страт і безліч ні ў чым не павінных ахвяр. Матыў страты вызначыў і прыхільнасць творцы да пэўных жанраў: верша-плачу («Плач спаленай вёскі»), верша-рэквіема («Рэквіем па кожным чацвёртым»), балады («Балада пра спаленую вёску і жывога пеўня»). Пісьменнік выкарыстоўвае сціслыя празаічныя прадмовы, якія з'яўляюцца супярэчлівымі па стылі і настраёвасці эпіграфамі, што ўзмацняе трагедыйнае гучанне твораў. Маштаб усенароднага гора А. Вярцінскі паказвае праз вобразы асобных людзей, якія нярэдка маюць прататыпаў. А. Вашчанка ўзгадвае: «Аднойчы міма Дзямешкава ішлі карнікі. Праз некаторы час вяскоўцы пачулі страляніну, убачылі чорныя клубы дыму. Назаўтра даведаліся, што суседнюю вёску Кісялёва карнікі спалілі, а жыхароў ад старога



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

да малога забілі. А яшчэ пачулі жахлівы аповед пра тое, як некалькі дзён "дыхала" магіла, куды карнікі скідалі кісялёўцаў, і як крычаў на вогнішчы здзічэлы певень» [4, с. 154]. Гэты трагічны выпадак паслужыў А. Вярцінскаму сюжэтам для шчымлівай «Балады пра спаленую вёску і жывога пеўня». Вайна для А. Вярцінскага – страшная, дзікая і антыгуманная дзея, што выходзіць за нормы чалавечай маралі. Яна накладвае глыбокі адбітак на людскую псіхалогію.

Найбольш яскравы і жывы вобраз ваеннай лірыкі паэта – маці, якая не прадстаўляе якога-небудзь канкрэтнага чалавека, а ўяўляе сабой абагульнены вобраз усіх жанчын, якія не дачакаліся сваіх сыноў з вайны (вершы «Маці на ўзгорку», «Ад вёскі да могілак паўвярсты…», «Замест эпітафіі» і інш.). У многіх вершах паэта гэты вобраз таксама ўвасабляе адчуванні зямлі, што назаўсёды страціла сваіх сыноў, бо яны ўжо ніколі не вярнуцца дадому і будуць спаць вечным сном у чужой зямлі. А. Вашчанка піша: «Светлы вобраз маці, Александры Рыгораўны, у А. Вярцінскага мае не толькі індывідуальны, але і агульначалавечы пачатак, бо лёс "маткі-салдаткі" і працаўніцы быў тады лёсам большасці славянскіх жанчын. А пакутлівы матыў страты самага блізкага чалавека да гэтага часу незагойным болем гучыць у сэрцы паэта» [2, с. 154]. Сапраўды, вельмі прачула гучаць наступныя радкі, боль лірычнага героя незагойны:

Вось твой лясок,
Вось твой пясок,
Вось твае сосны.
Твая яма.
Пачуць бы яшчэ раз:
«Сынок».
Паклікаць бы яшчэ раз:
«Мама» [6, с. 71].

Адзін з лепшых вершаў А. Вярцінскага на ваенную тэму – «Рэквіем па кожным чацвёртым» – створаны ў адметным жанры. Рэквіем – гэта ўрачыста-жалобны музычны або літаратурны твор, які прысвечаны памяці загінуўшых. Трагічная частка пачынаецца ўжо з эпіграфаў, узятых з дакумента, у якім значыцца, што «ў час мінулай вайны загінуў кожны чацвёрты беларус» [6, с. 19], і радкоў з народнай песні: «Ой, хацела мяне маці за чацвёртага аддаці…» [6, с. 19]. Назва верша і эпіграф эмацыйна ўзмацняюць гучанне тэмы верша. Ідзе час, а маці не забываюць сваіх загінуўшых дзяцей, раны застаюцца незагойнымі. Верш будуецца на эпічным паралелізме паміж высечаным лесам і «высечаным» народам, па якім прайшлася «сякера ваеннай навалы»:

Вы бачылі лес,
Дзе прагал скразны?
Скажыце, вы бачылі бор той,
Дзе кожнай другой няма сасны
ці сама меней – чацвёртай?
Тое ж было з народам маім.
Сякера ваеннай навалы
прайшлася бязлітасна па ім.
І – прагалы, прагалы.
Яны і сёння не зараслі,
свіццяцца прасторай мёртвай…
Вы бачылі лес,
дзе прагал скразны?
Скажыце, вы бачылі бор той? [6, с. 19]



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Верш «Два полі» будуецца на антытэзе. Паэт параўноўвае мірнае жыццё з жыццём падчас вайны праз супрацьпастаўленне двух розных палёў: аднаго – спакойнага, шчаслівага, ураджайнага, другога – крывавага поля бітвы, смерці:

Было ў салдата два полі,
поле, дзе кветкі ірваў,
бегаў з сябрамі на волі,
і поле, дзе ён ваяваў.
Ціха было і чыста
у полі яго дзяцінства,
былі агонь і дым
на полі ратным тым [6, с. 151–152].

Гэты невялікі верш нараджае ў сэрцы невыносны жаль і пранізлівую тугу, бо чытач назірае, як рэзка абрываецца маладое жыццё. Узмацненню драматызму спрыяе і кальцавая кампазіцыя верша. Спосабы тыпізацыі, стварэння мастацкага вобраза ў лірыцы А. Вярцінскага маюць свае асаблівасці. Малюючы пачуццё героя, аўтар піша перш за ўсё пра самога сябе, пра тое, што перажыта асабіста ім. Тлумачэнне думак і пачуццяў пісьменніка верша варта шукаць у культурна-гістарычных асаблівасцях эпохі, а не толькі ў фактах асабістай біяграфіі. Усё сваё жыццё А. Вярцінскі шукае высокае неба ідэалу. Адчуўшы вялікі адчай ад наступстваў вайны, з якой сутыкнуўся яшчэ ў маленстве, пісьменнік здолеў спраецыраваць на лірыку тыя падзеі, якія адбываліся шмат часу таму. Глыбокае асэнсаванне фактаў і эпічны маштаб паэтычнага мыслення ўласцівы яго вершам на ваенную тэму.

Нягледзячы на тое, што большасць твораў ваеннай тэматыкі А. Вярцінскага прысвечана болю і адчаю, таксама ёсць у паэта і вершы, якія маюць больш пазітыўны настрой. Радасць ад вызвалення сваёй Бацькаўшчыны – адна з найбольш значных тэм у яго ваеннай лірыцы. Прыкладам могуць служыць вершы «Балада пра спаленую вёску і жывога пеўня», «Рана ці позна», «Даруйце, даруйце!..» і інш.

Такім чынам, Анатоль Вярцінскі адносіцца да пакалення так званых паэтаў-бязбацькавічаў (выраз Р. Барадуліна). Вайна, закрануўшая дзяцінства творцы, пакінула адбітак на яго жыцці і значна паўплывала на погляды. Творца прыходзіць да высновы, што жыццё даецца толькі для таго, каб будаваць новае, а не знішчаць цэлыя народы. Ваенныя вершы А. Вярцінскага падштурхоўваюць чытачоў да глыбокага асэнсавання трагедыі беларускага народа. Антыгуманнаць нямецка-фашысцкіх захопнікаў асуджаецца ў кожным радку яго ваеннай лірыкі, якая ўражвае сваёй праўдзівасцю, пранізлівасцю фактаў, параўнанняў і дапамагае ў поўнай меры адчуць боль і цяжар страты беларускага народа. Пры раскрыцці гэтай тэмы для большай трагічнасці і драматычнасці, выразнасці і канатацыйнай афарбоўкі пісьменнік шырока ўжывае арыгінальныя метафары, якія ўжо даўно сталі агульнамоўнымі. Асноўны пафас ваенных вершаў А. Вярцінскага – пафас адстойвання чалавечнасці, гуманізму.

**Літаратура**

1 Баўтрэль, І. Непаўторнасць таленту: колькі слоў пра паэзію Анатоля Вярцінскага / І. Баўтрэль // Роднае слова. – 2011. – № 11. – С. 5–8.

2 Русілка, В. Паэтычныя ўрокі чалавечнасці / Вольга Русілка // Вярцінскі, А. Творы. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 2009. – С. 5–20.

3 Цвірка, К. Човен майго часу : З новай кнігі : Анатоль Вярцінскі; Аркадзь Куляшоў; Масей Сяднёў / К. Цвірка // Дзеяслоў. – 2017. – № 3. – С. 241–260.

4 Вашчанка, А. П. Слова пра старэйшага сябра / Аляксандр Вашчанка // Полымя. – 2016. – № 11. – С. 152–157.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

5 Драздова, З. У. Анатоль Вярцінскі / З. У. Драздова // Гісторыя беларускай літаратуры XX ст. : у 4 т. / НАН Беларусі, Інстытут літаратуры ; рэд.: У. В. Гніламедаў. – Мінск : Беларуская навука, 2004. – Т. 4, кн. 1. – С. 439–465.

6 Вярцінскі, А. Хлопчык глядзіць...: выбр. вершы і паэмы / Анатоль Вярцінскі. – Мінск : Маст. літ., 1992. – 318 с.

**УДК 811.161.3'42'371:2-187:821.161.3-32*М. Гарэцкі**

***В. А. Барадзін***

## КАНЦЭПТУАЛЬНАЯ ІДЭЯ Ў АПАВЯДАННІ М. ГАРЭЦКАГА «РУСКІ»

*Дадзены артыкул прысвечаны даследаванню моўнай рэалізацыі канцэптаў «жыццё» і «смерць» у апавяданні М. Гарэцкага «Рускі». Метадам суцэльнай выбаркі ў тэксце былі знойдзены словы, якія маюць у сваёй семантычнай структуры семы «жыццё» і «смерць» і рэалізуюць аднайменныя канцэпты. Усе выбраныя семантычныя адзінкі маюць адмоўную канатацыю і дапамагаюць зразумець задуму аўтара: паказаць цяжкасць жыцця і выбару падчас вайны. Смерць у творы перамагае, а жыццё набывае семантычныя адзнакі смерці.*

Ідэйны змест тэксту хвалюе як літаратуразнаўцаў, так і лінгвістаў, якія да вырашэння адназначнай праблемы падыходзяць рознымі шляхамі. Лінгвіст звяртае ўвагу на вербальныя спосабы выражэння ідэйнага зместу, а літаратуразнаўца, у сваю чаргу, звяртае ўвагу на вывучэнне аўтарскіх сэнсаўтваральных адзінак.

Мастацкі тэкст – карціна асабіста аўтарскага светабачання, якое з’яўляецца часткай нацыянальнай моўнай карціны свету, а асновай для вывучэння моўнай карціны свету і з’яўляюцца канцэпты.

У навуковай літаратуры ў пачатку XX ст. з’яўляецца тэрмін *канцэпт*, які і да цяперашняга часу не атрымаў адназначнага тлумачэння. Само паняцце мае шырокае распаўсюджанне ў сферы навуковых даследаванняў і трывала зацвердзілася ў сучаснай лінгвістыцы. Вельмі плённа працуюць над катэгорыяй канцэпту такія даследчыкі, як Н. Д. Аруцюнава, Г. Вяжбіцкая, А. С. Кубракова, С. Я. Нікіцін, Д. С. Ліхачоў, В. А. Маслава, І. А. Сцернін [1].

Адным з распаўсюджаных вызначэнняў гэтага тэрміна з’яўляецца вызначэнне Г. Вяжбіцкай, якая разумее пад канцэптам аб’ект са свету «Ідэальнае», які мае імя і адлюстроўвае культурна абумоўленае ўяўленне чалавека пра свет «Рэчаіснасць». Менавіта на яе работы далей мы абапіраемся, калі шукаем адзінкі, якія рэалізуюць канцэпты *«жыццё» і «смерць»* у творы М. Гарэцкага.

Тэкст можна разглядаць як адзін з магчымых спосабаў аб’ектывацыі свядомасці ці індывідуальна-аўтарскай карціны свету. З гэтых пазіцый канцэпт – «глыбінны сэнс, першапачаткова максімальна і абсалютна згорнутай сэнсавай структуры тэксту, якая з’яўляецца ўвасабленнем матыву, інтэнцый аўтара, якія прывялі да з’яўлення тэксту і ўтвараюць мастацкую карціну свету» [2, с. 202]. Гэты канцэпт можна назваць мастацкім, аўтарскім або тэкставым. Дадзеныя тэрміны практычна раўназначныя.

Мастацкі канцэпт непарыўна звязаны з такімі з’явамі, як мастацкі тэкст, мастацкая карціна свету, і таму разглядаецца ў комплексе лінгвакультурных, лінгвакраязнаўчых, культуралагічных, псіхалагічных і іншых аспектаў. Мастацкія творы з’яўляюцца адлюстраваннем як індывідуальнай свядомасці аўтара, так і ўсёй этнакультурнай супольнасці, да якой ён адносіцца, што дазваляе гаварыць як пра аўтарскую, так і пра нацыянальную канцэптасферу, адлюстраваную ў тым ці іншым тэксце.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ